Краеведческий кейс Солигорска

# ПРАЦОЎНЫЯ ПЕРАМОГІ САВЕЦКІХ БУДАЎНІКОЎ

Штодзённа газеты і радыё паведамляюць радасныя весткі аб працоўных перамогах будаўнікоў. У сярэднім за дзень у Савецкім Саюзе здаюцца ў эксплуатацыю тры буйныя прамысловыя прадпрыемствы, пракладваюцца дзесяць кіламетраў чыгуначных ліній, каля 100 кіламетраў ліній электраперадач, з будаўнічага канвеера сыходзіць прыкладна дзесяць тысяч кватэр у гарадах і дзве з палавінай тысячы дамоў на сяле.

Будаўніцтва ў нашай краіне стала сапраўды ўсенароднай справай, а атрад будаўнікоў— адным з перадавых у магутнай арміі савецкага рабочага класа.

Прафесія будаўніка ў нас, у рэспубліцы, самая распаўсюджаная. І дзіўнага ў гэтым нічога няма. Нездарма ж мы называем Беларусь велізарнай будаўнічай пляцоўкай.

За мінулыя дзесяць гадоў у Беларусі ўступіла ў строй больш як 100 новых буйных прамысловых прадпрыемстваў. У 1958 годзе ў рэспубліцы пачата будаўніцтва пяці буйнейшых хімічных прадпрыемстваў: першага і другога Салігорскіх калійных камбінатаў, Полацкага нафтаперапрацоўчага завода, Гродзенскага азотна-тукавага завода і Светлагорскага завода штучнага валакна.

Нябачанымі маштабамі і тэмпамі вядзецца і жыллёвае будаўніцтва. За апошнія дзесяць гадоў у гарадах і рабочых пасёлках рэспублікі пабудавана жылых дамоў агульнай плошчай 15,1 мільёна квадратных метраў, або ў 1,6 раза больш, чым было пабудавана за ўсе гады Савецкай улады да 1953 года. Акрамя таго, калгаснікамі і сельскай інтэлігенцыяй узведзена 212 тысяч жылых дамоў.

І ў самой будаўнічай вытворчасці адбыліся такія яркія перамены, што часам яны здаюцца казачнымі. І сапраўды, шматпавярховы 60—80-кватэрны дом вырастае за 25—30 дзён. Глядзіш і здзіўляешся, як на ўчарашняй пустэчы ўзнікае пяціпавярховы прыгажун, а побач — яшчэ і яшчэ. Ужо не асобнымі будынкамі і нават кварталамі, а цэлымі масівамі і мікрараёнамі ўзводзяцца жылыя дамы. І няма вакол дамоў штабеляў цэглы, не відаць мітусні рабочых, па сутнасці няма і прывычнай будаўнічай пляцоўкі: яна ператворана ў мантажную, дзе толькі завяршаецца складаны працэс нараджэння дома, пачаты на заводзе.

Шырокая індустрыялізацыя —найбольш характэрная асаблівасць цяперашняй будаўнічай вытворчасці. Іменна гэты шлях дазваляе з году ў год хутка нарошчваць тэмпы будаўніцтва.

Цяпер Беларусь выпускае ў год больш аднаго мільёна кубаметраў зборнага жалезабетону. У рэспубліцы створана і працягвае развівацца база буйнапанельнага домабудавання, агульная магутнасць якой цяпер дасягае 490 тысяч квадратных метраў. У бліжэйшы час мы зможам поўнасцю перайсці на поўназборнае жылое будаўніцтва не толькі ў абласных, але і ў раённых цэнтрах, а таксама ў сельскай мясцовасці.

Ідзе карэнная перабудова нашых вёсак і стварэнне на тэрыторыі калгасаў і саўгасаў буйных населеных пунктаў гарадскога тыпу. Ужо ўзніклі пасёлкі, якія па ўзроўню камунальнага абслугоўвання нічым не адрозніваюцца ад горада.

Паспяхова ідзе будаўніцтва цэнтральнай сядзібы саўгаса «Волма» Мінскага раёна. Тут узведзены двух- і чатырохпавярховыя будынкі, ёсць усе віды добраўпарадкавання: цэнтральнае ацяпленне, вадаправод, каналізацыя і газіфікацыя. Пачалі ўзводзіць шматкватэрныя жылыя дамы таксама калгаснікі сельгасарцелей «Рассвет» Кіраўскага раёна, «Слава працы» Слонімскага раёна, імя 16-ці партызан Пухавіцкага раёна, імя Дзяржынскага Маладзечанскага раёна, імя Калініна Нясвіжскага раёна і многія іншыя.

Калгасныя населеныя пункты забудоўваюцца па тыпавых праектах з цэглы, бетону, буйнаразмерных блокаў і панелей. Будаўніцтва ў калгасах вядуць міжкалгасныя будаўнічыя арганізацыі, якія за кароткі тэрмін стварылі сваю вытворчую базу: пабудавалі 59 цагельных і 9 фібралітавых заводаў, 18 палігонаў па вытворчасці жалезабетону, маюць патрэбную тэхніку.

Цяпер стотысячная армія беларускіх будаўнікоў змагаецца за тое, каб з гонарам выканаць план пятага года сямігодкі. У гэтым годзе неабходна выканаць аб'ём будаўніча-мантажных работ на суму 330 мільёнаў рублёў, або на 16,3 працэнта больш, чым у мінулым годзе. Трэба будзе ўвесці ў эксплуатацыю 877 тысяч квадратных метраў жылля, 95 агульнаадукацыйных школ, 18 бальніц, 92 дзіцячыя ўстановы, 121 жывёлагадоўчае памяшканне і 16 рамонтных майстэрань. Акрамя таго, прадугледжваецца забяспечыць увод у эксплуатацыю і пад мантаж больш як 700 тысяч квадратных метраў вытворчых плошчаў, 5 буйных халадзільнікаў, тры мясакамбінаты, 8 прадпрыемстваў малочнай прамысловасці, цукровы завод. Уступаюць у строй многія прамысловыя аб'екты, у тым ліку на першым Салігорскім калійным камбінаце і Гродзенскім азотна-тукавым заводзе. Сіламі сельскіх будаўнікоў у 1963 годзе ў калгасах будзе ўзведзена 2.565 жывёлагадоўчых памяшканняў, 2.134 вытворчыя і 886 культурна-бытавых будынкаў, пабудавана 37 тысяч дамоў для калгаснікаў.

План вельмі напружаны. Але ён будзе выканан. Залогам таму паспяховае выкананне паўгадавога плана будаўніцтва ў рэспубліцы, датэрміновае завяршэнне будаўніцтва і ўвядзенне ў дзеянне тэхналагічных установак першай чаргі Полацкага нафтаперапрацоўчага завода. Вялікая армія савецкіх будаўнікоў знаходзіцца ў першых радах штурмуючых рубяжы камунізма.

**І. МІШКЕВІЧ.**

**«БУДАЎНІК КАМУНІЗМА»**
**3 стар. 10 жніўня 1963 г.**